WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

2 КАСТРЫЧНІКА 2010 г.
СУБОТА
№ 193
(26801)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Надвор'е

## ХОЛАДНА І СОНЕЧНА — ДА ЧАЦВЯРГА

**На выхадныя на тэрыторыю Беларусі завітае даволі халодны арктычны антыцыклон, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Сёння невялікія дажджы будуць толькі месцамі, удзень 7—13. У нядзелю амаль паўсюдна ўначы чакаюцца замаразкі да 0 — мінус 5, удзень — плюс 6—12 градусаў. Да чацвярга сонечна, увогуле без дажджоў. Удзень плюс 7—13, уначы 0 — мінус 5. У Мінску будзе сонечна і ўдзень, 8—10 цяпла. Такому надвор'ю айчынныя сіноптыкі нават далі ўласную назву — Скандынаўская залатая восень.

Такое надвор'е працягнецца ўсю першую дэкаду кастрычніка. Потым чакаюцца атлантычныя цыклоны, а ў другой палове месяца «запланаваны» першы снег. Кастрычнік па тэмпературным рэжыме будзе недзе ў межах нормы (плюс 5—8), у норме будуць і ападкі (40—60 мл).

**Сяргей КУРКАЧ.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «ПРАВА ВЫБАРУ МЫ ЗАХАВАЕМ ЗА НАРОДАМ»

**УЧОРА Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў прэс-канферэнцыю для прадстаўнікоў СМІ з розных рэгіёнаў Расіі. Такія сустрэчы сталі традыцыйнымі: з 2003 года гэта ўжо восьмая, самая прадстаўнічая група расійскіх журналістаў, якая змагла на свае вочы пазнаёміцца з Беларуссю і атрымаць адказы на пытанні, якія цікавяць расіян, з першых вуснаў. Галоўная мэта такіх прэс-тураў — данесці да мільёнаў расіян праўдзівую, незамутненую інфармацыю аб нашай краіне. Сёння гэта асабліва актуальна: калі раней расійская інфармацыйная прастора была для беларускай тэматыкі проста закрытай, то сёння ў яе мэтанакіравана закачваецца плынь падману і дэзынфармацыі. Пра мэту не цяжка здагадацца.**

**Вітаючы расійскіх рэгіянальных журналістаў, Аляксандр Лукашэнка падзякаваў ім за тое, што яны нясуць праўду пра Беларусь, хоць сёння гэта і не проста. Каб пераканацца, дастаткова паглядзець цэнтральнае расійскае тэлебачанне. Разам з тым, кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў упэўненасць у тым, што расійскі народ абавязкова зможа разабрацца ў тым, што адбываецца.**



Фота БЕЛТА.

### Аб перспектывах адносінаў з Расіяй

Беларусь не збіраецца адказваць на гразь у расійскіх СМІ, у прыватнасці заявіў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт адзначыў: «У нас ёсць стапрацэнтныя доказы таго, як гэта рабілася, прытым з канкрэтнымі кадрамі, з канкрэтным матэрыялам: хто гэта рабіў, хто даваў каманды... Усё гэта ў нас ёсць».

«Мы не будзем маўчаць, калі сітуацыя запатрабуе адказу. Але сёння на што адказваць? На тую гразь, якая льецца? Чакаюць, што мы пачнём уцягвацца ў гэтую бойку... Мы на гэтую гразь сёння адказваць не будзем — каб самім не перапэцкацца», — падкрэсліў ён.

На думку кіраўніка дзяржавы, цяпер няма такой сітуацыі, калі ў адказ на гэтыя «гарматныя стрэлы» трэба таксама «грукатаць з усіх гармат».

Расійскія цэнтральныя СМІ досыць актыўна выкарыстоўваюць для нападак на Беларусь і мясцовую апазіцыю.

«Самае страшнае, што яны прадставілі права вяшчаць людзям, якія на дух не пераносяць Расію. Гэта людзі, якія ўчора і сёння атрымліваюць гранты ў Заходняй Еўропе і Амерыцы. Але сёння яшчэ адзін спонсар у іх знайшоўся — бізнэс Расіі», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Ён таксама дадаў, што расійскае кіраўніцтва шмат чаго не ведае пра тое, што адбываецца ў Беларусі, які настрой людзей.

«Калі яны робяць стаўку на бескарысных і бесперспектыўных людзей у Беларусі, значыць, яны не вельмі сур'ёзна настроеныя з намі страціць адносіны. Можа, крыху хочуць нас нахіліць, прыструніць... Калі б яны сур'ёзна хацелі гэтым займацца, мы гэта бачылі б», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што ў Беларусі каля 400 чыстых апазіцыянераў: «...Самае большае, з іх прыхільнікамі, якія ў адкрытую могуць процістаяць уладзе на мітынгах, — 800 чалавек. Напэўна, яшчэ 100—150 тыс. могуць іх падтрымаць на выбарах».



Фота БЕЛТА.

Нягледзячы на складанасці, якія існуюць на цяперашнім этапе, Аляксандр Лукашэнка лічыць добрымі перспектывы развіцця адносінаў з Расіяй.

«Умоўна падзелім узаемаадносіны паміж Беларуссю і Расіяй на два-тры ўзроўні, якія датычацца сувязяў паміж людзьмі, прадпрыемствамі, рэгіёнамі і вышэйшым кіраўніцтвам краін, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Першы — гэта ўзаемаадносіны паміж людзьмі і паміж прадпрыемствамі. Там, дзе яшчэ палітыка не ўмяшалася ў гэтыя адносіны, усё ідзе больш-менш нядрэнна. Асабліва на ўзроўні людзей. Думаю, тут вельмі складана выбудаваць якія-небудзь бар'еры і сутыкнуць нашы народы. Таму ўсё тое, што зроблена, у тым ліку ў Саюзнай дзяржаве, калі мы імкнуліся выраўнаваць правы грамадзян Расіі і Беларусі, а зроблена было нямала, разбурыць гэта наўрад ці хто-небудзь зможа, калі, зразумела, Расія не адмовіцца ад тых напрацовак і заканадаўчых актаў, дагавораў, якія падпісаныя. Але я думаю, што не адмовіцца, таму што гэта будзе на шкоду расійскаму грамадству і расіянам». Аляксандр Лукашэнка пры гэтым адзначыў, што Беларусь будзе «свята выконваць тыя дамоўленасці, якія датычацца ўзаемаадносінаў нашых народаў».

«Калі браць прадпрыемствы, куды яшчэ не паспелі ўмяшацца зацікаўленыя людзі і палітыкі, то тут таксама больш-менш нармальныя адносіны. Тавараабарот за 6 месяцаў гэтага года вырас прыкладна на 30 працэнтаў. А гэты паказчык, як вядома, робяць прадпрыемствы», — сказаў Прэзідэнт.

Ва ўзаемаадносінах рэгіёнаў, рэгіянальных лідараў не ўсё дрэнна, але і не так добра, як было раней, лічыць беларускі лідар. «У свой час губернатары мелі большую ступень свабоды ў сувязі з тым, што яны выбіраліся народам. Не памятаю, каб было якое-небудзь процідзеянне для наведвання імі Беларусі, і мы вельмі многае зрабілі. Але сёння невялікія пагаршэнні ёсць, таму што ёсць указанні з цэнтра — туды ехаць, сюды не ехаць, гэта вырашаць, тое не вырашаць». У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка выказаў думку аб тым, што ў Расіі губернатары павінны выбірацца народам. У той жа час права вызваляць іх на пасады павінен мець прэзідэнт. Ён нагадаў, як у свой час Беларусь крытыкавалі за стварэнне вертыкалі ўлады, якую пазней стала выкарыстоўваць і Расія. «Але Расія не Беларусь. Адна справа — у Беларусі назначыць губернатара ў Брэсцкай вобласці, дзе я кожную раніцу бачу, што там адбываецца. Іншая справа — у Маскве назначыць губернатара Прыморскага края і інш. Ёсць розніца? І сёння гэта ўжо дае збой», — лічыць Прэзідэнт Беларусі.

У той жа час кіраўнік дзяржавы адзначыў, што не крытыкуе расійскую рэчаіснасць. «Я не крытыкую расійскую рэчаіснасць. Не. Расійскае кіраўніцтва лепш ведае. Я, можа, не маю рацыі. Можа, пакуль гэта формула працуе», — сказаў ён.

«Што датычыцца нашых адносінаў на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў, то, мякка кажучы, яны вымушаюць жадаць лепшага. Напэўна, мне няма неабходнасці характарызаваць гэтыя адносіны, вы бачыце, што адбываецца апошнім часам, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — І, нягледзячы на гэта, я перакананы: не думаю, што гэтая тактыка, што гэтая стратэгія расійскага кіраўніцтва сыдзе на нішто. Таму што страціць Беларусь для Расіі — гэта катастрофа. Катастрофа не толькі геапалітычнага маштабу, але і перш за ўсё маральнага».

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў: «Беларусы — самы блізкі і надзейны народ для Расіі. Гэта фактычна адзін народ — расіяне і беларусы. Чаму я гавару пра маральны аспект. Вы ведаеце, як адрэагуе на гэта расійскае грамадства. Таму мне здаецца, што гэтая неабдуманая палітыка (калі б думалі, не рабілі б), якая навязваецца сёння нам, недаўгавечная. Таму перспектывы ў нашых адносінаў — добрыя. Аснова і база для гэтага ёсць. Як бы мы сёння ні спрабавалі замоўчваць поспехі, якія мы маем, — няхай нават і невялікія ў рамках праектаў Саюзнай дзяржавы — яны ўсё ж такі ёсць. І ніводная дзяржава з Расіяй такіх адносінаў не мае».

«Што датычыцца Беларусі, калі будзе на гэта воля расійскай дзяржавы і перш за ўсё кіраўнікоў, на працягу трох месяцаў — максімум паўгода мы не проста выбудуем адносіны, не проста вернемся на той узровень добрых адносінаў, які ў нас існаваў, але і значна перасягнём гэты ўзровень. Мы да гэтага гатовы, як вы разумееце, слова не за намі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

СТАР. 2

Калектыву рэдакцыі «Народнай газеты»

**ДАРАГІЯ СЯБРЫ!**

**Сардэчна віншую вас з 20-годдзем выхаду ў свет першага нумара вашага выдання.**

«Народная газета» — равесніца суверэннай Беларусі, сведка паступовага развіцця нашай дзяржавы. І хоць станаўленне яе было няпростым, у апошнія гады выданне з'яўляецца надзейным праваднікам дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі. Ваша газета дапамагае чытачам аб'ектыўна ацэньваць падзеі, што адбываюцца ў нашай краіне і за мяжой.

Упэўнены, што нацэленасць на будучыню, стваральная энергія і высокі творчы патэнцыял вашага калектыву стануць залогам плённай працы на карысць нашай Радзімы.

Ад усёй душы зычу супрацоўнікам, аўтарам і чытачам «Народнай газеты» моцнага здароўя, невычэрпнага натхнення, поспехаў і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Віншуем!

## ДЭВІЗ «НАРОДНАЙ» — ІНФАРМАВАЦЬ, ПЕРАКОНВАЦЬ, ДАПАМАГАЦЬ

**Дваццаць гадоў таму выйшаў першы нумар «Народнай газеты». Мы віншуем калег, шчыра радуемся за іх, тым больш што сярод людзей, якія робяць «Народную», ёсць і былыя «звяздоўцы». Як шчыруюць на інфармацыйнай ніве нашы калегі — паспрабуем выведаць некаторыя сакрэты «журналісцкай кухні» ў галоўнага рэдактара «Народнай газеты» Уладзіміра АНДРЫЕВІЧА.**

СТАР. 2

Прамая лінія

## Дапамогі, пенсіі, паслугі

**Адрасная сацыяльная дапамога і варыянты сацыяльных паслуг, асаблівасці вылічэння стажу і індывідуальнага каэфіцыента, пенсійныя надбаўкі і павышэнні — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» нашай газеты з удзелам намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціны Вікенцьеўны Каралёвай.**

Такім чынам, увага! Паводле папярэдняй дамоўленасці, «прамая лінія» будзе праходзіць **з 11 да 12 гадзін 13 кастрычніка** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8 017) 292 38 92 і 232 38 21**. Нумар для папярэдніх пытанняў — **287 17 57**.

## ДРЭННАЕ НАДВОР'Е ПАПРАВІЎ ПРЫГОЖЫ ФУТБОЛ!

**30 верасня 2010 года беларускія аматары футбола запоўняць надоўга. Чэмпіён краіны барысаўскі БАТЭ ў Лізе Еўропы ўпэўнена перайграў на мінскім стадыёне «Дынама» леташняга чэмпіёна Галандыі, клуб АЗ з Алкмаара — 4:1! Такі «мяшэчак» галоў у асноўнай сетцы другога па вартасці клубнага еўрапейскага турніру барысаўчане «адгрузілі» даволі не слабаму суперніку ўпершыню.**



Фота БЕЛТА.

Перамогі ў гэтым матчы чакалі многія прыхільнікі беларускага футбола, але што яна адбудзецца такой — меркаваў мала хто. Барысаўчане літаральна ляталі па полі на працягу ўсяго матча, выдатна гулялі ў пас і часта ўзрывалі трыбуны на стадыёне, дэманструючы цудоўную тэхніку. Матч выдаўся шчодрым на пенальці, прычым, на погляд балельшчыкаў, два з іх былі незразумелымі, можа таму і гульцам не ўдалося іх рэалізаваць. Але ў БАТЭ ў той вечар было каму забіваць — Віталь Радзівонаў, Арцём Канцавы, Рэнан Брэсан і Эдгар Аляхновіч чатыры разы ўводзілі ў транс галандскую каманду і выклікалі выбухі радасці на ўсё тым жа стадыёне, і, без сумнення, — каля тэлеэкранаў. Напрыканцы матча не сапсаваў настрою беларусам адзіны гол Сігтарсана. Пасля пройгрышу кіўеўскага «Дынама» ў гасцях ціраспальскаму «Шэрыфу» барысаўчане ўзначалілі з чатырма ачкамі групу Е.

### ВЫНІКІ АСТАТНІХ МАТЧАЎ:

група А «Лех» — «Зальцбург» — 2:0, «Манчэстэр Сіці» — «Ювентус» — 1:1, група В «Русенборг» — «Арыс» — 2:1, «Атлетыка» — «Баер» — 1:1; група С «Гент» — «Ліль» — 1:1, «Спортынг» — «Леўскі» — 5:0; група D ПАОК — «Дынама» (Заграб) — 1:0, «Вільярэал» — «Бруге» — 2:1; група F ЦСКА (Расія) — «Спарта» — 3:0, «Палерма» — «Лазана» — 1:0; група G; «Хайдук» — «Андэрлехт» — 1:0, «Зеніт» — АЕК — 4:2; група Н «Адэнсе» — «Штутгарт» — 1:2, «Янг Бойз» — «Хетафе» — 2:0; група І «Сампдорыя» — «Дэбрэцен» — 1:0, «Металіст» — ПСВ «Эйндховен» — 0:2; група J «Пары Сэн-Жэрмэн» — «Карпаты» — 2:0, «Барусія» — «Севілья» — 0:1; група К «Сцяуа» — «Напалі» — 3:3, «Утрэхт» — «Ліверпуль» — 0:0; група L «Рапід» — «Бешыкташ» — 1:2, ЦСКА (Балгарыя) — «Порту» — 0:1.

ISSN 1990 - 763X

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

4 кастрычніка 2010 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца адкрыццё пятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

**АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ**

**WWW.RLT.BY**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Борисовском райисполкоме,**

проводит открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства **изолированного помещения (гараж), об. пл. 189,2 кв.м, расположенного по адресу: Минская обл., г. Борисов, ул. Даумана, 78, и.п. № 3.**

**Начальная цена – 133 611 000 бел. рублей.**

**Задаток в сумме 10 000 000 бел. рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.** Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты проведения торгов.

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **02.11.2010** в 15.00 по адресу: Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 01.11.2010** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, к. 324.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

## ЁСЦЬ ПАЎФІНАЛ!

**Услед за футбалістамі нас вельмі парадавалі беларускія дзяўчаты ў прыгожых сукенках. А менавіта — жаночая зборная Беларусі па баскетболе, якая на чэмпіянаце свету ў Чэхіі стварыла сапраўдную сенсацыю, абыграўшы ў 1/4 фіналу з лікам 70:53 каманду Расіі, аднаго з фаварытаў першынства.**

Лепшай у складзе нашых стала Алена Леўчанка — 17 ачкоў. Галоўны трэнер зборнай Анатоль Буяльскі пасля гульні не мог знайсці слоў: «Хачу падзякаваць сваім дзяўчатам, якія сёння тварылі гісторыю. Больш у мяне няма слоў», — цытуе Буяльскага афіцыйны сайт ФІБА. Сёння ў паўфінале беларускі згуляюць з пераможцай пары Аўстралія — Чэхія. Перамога над расіянкамі з'яўляецца першай у сустрэчах гэтых каманд паміж сабой, і тым яна каштоўная, што адбылася ў такі патрэбны момант. Хто потым успомніць два верасНёўскія паражэнні дома ў таварыскіх сустрэчах? Так трымаць, дзяўчаты, віншуем і яшчэ мацней балеем за вас!



Гаспадары

## НАСТАЎНІЦКІ МЁД

**НА фотаздымку — настаўнік вышэйшай катэгорыі, а зусім не рамеснік-пчаляр, як можа гэта падацца. Але такіх пчаляроў, як Аляксандр Стрыжнёў, яшчэ трэба пашукаць. Як добры настаўнік не можа абысціся без сваіх вучняў і калег, гэтак і пчаляр не здольны мець добры мёд без памочнікаў. Таму на здымку Аляксандр разам са сваім памагатым у мядовай справе — 80-гадовым бацькам Пятром Мікітавічам, жыхаром вёскі Келесы Сенненскага раёна.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Школьны гісторык Стрыжнёў, як і належыць сапраўднаму гісторыку, любіць адчыняць малавядомыя старонкі мінуўшчыны. Найперш вакол сябе, на родным лапіку зямлі. Яму прынцыпова важна, каб вучнёўскі патрыятызм пачынаўся з ведання ўласнага радаводу, сваіх каранёў і гісторыі вёскі. Любоў да вялікай Радзімы не можа з'явіцца на пустым месцы, без пачуццяў да радзімы маленькай. «Любіць — найперш ведаць», — кажа школьны настаўнік. Ён ладзіць краязнаўчыя вандроўкі, паходы па месцах баявой славы, натхняе вучняў на запісы ўспамінаў вясковых старажылаў, выпрацаваў з дзецьмі экалагічна-гістарычную сцяжыну па наваколлях. Працуючы ў Студзёнкаўскай сярэдняй школе, настаўнік і вучні сабралі калекцыю прадметаў побыту і гісторыі, якой хапіла на паўнавартасны музей.

Кажуць, настаўнікам трэба нарадзіцца. Але аднаго прызвання Аляксандру было мала. У яго дзве вышэйшыя адукацыі. Свой першы дыплом настаўніка — моваведа атрымаў у Віцебскім педінстытуце. Пазней скончыў Гомельскі ўніверсітэт па спецыяльнасці выкладчыка гісторыі і грамадскіх навук. Педагагічны стаж Стрыжнёва — чвэрць стагоддзя, і, спазнаўшы ўсе бакі працы вясковага настаўніка, ён небеспадстаўна жартуе: «Як не маеш дарогі, то ідзі ў педагогі». Так, праца настаўніка на сяле не заўсёды ўдзячная. Але з-за гэтага сапраўдныя спецыялісты сваю справу любяць не менш. І акрамя асноўнага прадмета, Стрыжнёў вядзе ў школе (дарэчы, лепшай навучальнай установе Віцебскай вобласці па азеляненні і добраўпарадкаванні) прафесійнае навучанне па трактарнай справе. Яго выпускнікі разам з атэстатам атрымліваюць правы і маюць прафесію механізатара. На факультатыве беларусазнаўства Аляксандр Пятровіч адкрывае дзецям свет пчалярнай справы, якую ён спасцігаў уласным досведам і валодае ёю на ўзроўні лепшых прафесіяналаў.

— На агонь, ваду і працу пчол можна глядзець бясконца, — кажа пчаляр-аматар. Ён ведае, што адзін з ягоных прадзедаў якраз займаўся пчоламі і, калі качаў мёд, заўсёды частаваў вясковых дзяцей. Аднойчы, даследуючы музейныя знаходкі, Аляксандр прачытаў у «Віленскіх епархіяльных ведамасцях» 1873 года пра дасягненні ў галіне пчалярства і новы на той час вулей Лявіцкага. І захацеў распачаць сваю пчалярскую справу менавіта па даўняй тэхналогіі.

— Першы год я не ўбачыў ні лыжкі мёду, — усміхаецца настаўнік. — А першы мёд — 90 літраў — атрымаў толькі на наступны год.

Цяпер ягоны пчальнік налічвае дваццаць дамкоў. У звычайны медазбор з кожнага вулля атрымлівае па два вядры. Вось і сёлета добры мёд не абышоў ягоную гаспадарку бокам.

— Настаўніцкія абавязкі не перашкаджаюць мне ў працы з пчоламі. І наадварот. У любой справе без сапраўднага захаплення вынікаў не дасягнеш. Працуючы на пчальніку, я адпачываю ад школьнай мітусні. Гледзячы на бясконцую працу пчол, разумею, які ўсё ж нялёгкі гэты смачны і карысны нам мёд.

Цяпер у пчаляра два клопаты — выпускны 11 клас і перадзімовая рэвізія пчальніку.

Перспектыва

## ІЛЬГОТНЫ ЖЫЛЛЁВЫ КРЭДЫТ МОЖА ПАТАННЕЦЬ І ДЛЯ ЖЫХАРОЎ СЯРЭДНІХ ГАРАДОЎ

**Для далейшага ўдасканальвання льготнага крэдытавання жыллёвага будаўніцтва і актывізацыі развіцця населеных пунктаў, спецыялістамі будаўнічай галіны распрацаваны праект Указа, дзе ўдакладняюцца асобныя пытанні жыллёвага будаўніцтва. Падрабязнасці паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Уладзімір ДАРАПІЕВІЧ.**

***— Чытачы нашага выдання адзначаюць, што будаваць жыллё нават з дзяржаўнай падтрымкай апошнім часам робіцца непасільнай фінансавай ношай для небагатых беларусаў...***

— Адразу адзначу прыемную навіну для гэтай катэгорыі грамадзян. Згодна з распрацаваным праектам Указа кіраўніка дзяржавы, прадугледжваецца распаўсюдзіць на грамадзян, якія пастаянна жывуць і працуюць у населеных пунктах з насельніцтвам да 50 тысяч чалавек і ў гарадах **Кобрыне, Слуцку, Рэчыцы і Светлагорску**, умоў жыллёвага льготнага крэдытавання, што дзейнічаюць для грамадзян, якія жывуць і працуюць у малых гарадах з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек. На практыцы гэта азначае, што чаргавікі акрэсленых гарадоў змогуць атрымліваць больш прывабныя крэдыты пад 1 працэнт гадавых тэрмінам на 40 гадоў.

Спецыялістамі было падлічана, што з улікам ільготна крэдытуемай плошчы на сям'ю з чатырох чалавек, калі сярэдні кошт квадратнага метра вызначаны ў памеры -1 млн 800 тысяч рублёў пры будаўніцтве жылых памяшканняў з аздабленнем, велічыня льготнага крэдыта складзе 144 млн рублёў. Пасля прыняцця праекта Указа выплаты па жыллёвых крэдытах істотна паменшацца. Так, напрыклад, пры будаўніцтве кватэры сям'ёй з чатырох чалавек штомесячная эканомія сямейнага бюджэту можа скласці 590 тысяч рублёў.

***— Калі пачнуць дзейнічаць нормы новага Указа?***

— Цяпер ідзе гаворка толькі аб праекце дакумента, аднак у ім ёсць адна слушная прапанова. У мэтах аднолькавага падыходу і прадухілення скаргаў ад грамадзян у праекце Указа прапануецца гэтыя нормы па зніжэнні працэнтных ставак і працягванні тэрміну крэдытавання распаўсюдзіць таксама на крэдытныя дагаворы, згодна з якімі грамадзяне атрымаюць льготныя крэдыты на будаўніцтва жылля ў дамах, якія не былі ўведзеныя ў эксплуатацыю да 1 сакавіка 2010 года.

***— Вамі падрыхтаваныя новаўвядзенні і для шматдзетных сем'яў?***

— Праект Указа дазваляе шматдзетным сем'ям, якія будуюць жыллё ў населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 50 тысяч чалавек і ў гарадах Кобрыне, Слуцку, Рэчыцы і Светлагорску, атрымліваць дадатковы льготны крэдыт для будаўніцтва гаспадарчых пабудоў у памеры 20 працэнтаў ад кошту будаўніцтва нарматыўнай крэдытуемай плошчы.

***— Праектам Указа прадугледжваецца і пэўная фінансавая дапамога маладым сем'ям, якія будуюць жыллё?***

— Міністэрствам фінансаў падрыхтаваныя дапаўненні ва Указ кіраўніка дзяржавы № 185. У прыватнасці, прадугледжваецца аказанне фінансавай дапамогі маладым сем'ям пры нараджэнні першага і (або) другога дзіцяці пасля заключэння льготнага жыллёвага дагавора ў памерах адпаведна 10 і 20 працэнтаў ад сумы запазычанасці па выдадзеных крэдытах. Механізм такой фінансавай дапамогі будзе ажыццяўляцца роўнымі долямі, аналагічным парадкам, як для шматдзетных сем'яў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 02 ноября 2010 года повторно проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества ОАО «ТД «Белресурсы» (продавец):

| Номер лота | № 1 | | |
|---|---|---|---|
| | | Инв. № (кадастр.) | Инв. № (бухг.) |
| Наименование продаваемого имущества | Административное здание, площадь 60 кв. м | 710/С-57358 | 11871 |
| | Производственно-заготовительный участок сбора вторичных ресурсов, площадь 365,6 кв. м | 710/С-57359 | 11876 |
| | Склад, площадь 287,9 кв. м | 710/С-57360 | 11877 |
| | Зеленые насаждения | | 12006 |
| Сведения о земельном участке | кадастровый номер 741000000010003390, площадь 0,4727 га | | |
| Местонахождение продаваемого имущества | Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Ковзана Б.И., 5/294 | | |
| Начальная цена | 512 852 800 белорусских рублей без учета НДС | | |
| Сумма задатка | 50 000 000 белорусских рублей | | |

| Номер лота | № 2 | | |
|---|---|---|---|
| | | Инв. № (кадастр.) | Инв. № (бухг.) |
| Наименование продаваемого имущества | Мастерская, площадь 1337,0 кв. м | 410/С-19277 | 11607 |
| | Водопровод | | 11611 |
| | Электрокабель | | 11806 |
| | Мощение | | 11609 |
| | Ограждение. Ворота. Калитка | | 11610 |
| | Административное здание, площадь 125,9 кв. м | 410/С-20625 | 11608 |
| | Объекты озеленения | | 11800 |
| | Объекты озеленения | | 11801 |
| | Объекты озеленения | | 11802 |
| Сведения о земельном участке | кадастровый номер 420850100001006261, площадь 1,9309 га | | |
| Местонахождение продаваемого имущества | Гродненская область, Волковысский район, г. Волковыск, ул. Жолудева, д. 76 | | |
| Начальная цена | 1 060 192 000 белорусских рублей без учета НДС | | |
| Сумма задатка | 100 000 000 белорусских рублей | | |

| Номер лота | № 3 | | |
|---|---|---|---|
| | | Инв. № (кадастр.) | Инв. № (бухг.) |
| Наименование продаваемого имущества | Сторожка, площадь 16,9 кв. м | 451/С-11478 | 11998 |
| | Склад тары, площадь 842,1 кв.м | 451/С-3331 | 11645 |
| | Мастерская | | 12011 |
| | Склад | | 12012 |
| | Навес | | 12013 |
| | Склад с мастерской, площадь 228,4 кв. м | 451/С-3332 | 11646 |
| | Пристройка | | 12014 |
| | Мастерская. Гараж | | 12015 |
| | Контора с котельной, площадь 138,6 кв. м | 451/С-3333 | 11651 |
| | Забор площадью 710 кв. м | | 11999 |
| | Металлические ворота | | 12000 |
| | Зеленые насаждения | | 11809 |
| | Зеленые насаждения | | 11810 |
| | Электрическая сеть | | 11808 |
| Сведения о земельном участке | кадастровый номер 422356300002000209, площадь 1,0927 га | | |
| Местонахождение продаваемого имущества | Гродненская область, Дятловский район, г.п Новоельня, ул. Железнодорожная, д. 7а | | |
| Начальная цена | 149 584 000 белорусских рублей без учета НДС | | |
| Сумма задатка | 14 000 000 белорусских рублей | | |
| Сведения об обременениях | договор аренды от 01.04.2010 (арендуемая площадь 42,9 кв.м) | | |

| Номер лота | № 4 | | |
|---|---|---|---|
| | | Инв. № (кадастр.) | Инв. № (бухг.) |
| Наименование продаваемого имущества | Трансформатор силовой ТМ-100/10 кВт | | 11723 |
| | Бункер | | 11641 |
| | Электрошкаф | | 11625 |
| | Одноэтажное кирпичное здание склада хранения тары, площадь 799,5 кв. м | 412/С-12605 | 11618 |
| | Котельная | | 11614 |
| | Дымовая труба | | 11991 |
| | Трансформаторная подстанция | 412/С-12606 | 11617 |
| | Воздушная линия | | 11990 |
| | Кабельная линия | | 11996 |
| | Кабельная линия | | 11997 |
| | Кабельная линия | | 11989 |
| | Одноэтажное кирпичное здание цеха, площадь 446,5 кв. м | 412/С-12607 | 11615 |
| | уборная | | 11988 |
| | Сарай | | 12017 |
| | Сарай | | 11993 |
| | Сарай | | 11994 |
| | Сарай | | 11995 |
| | Пристройка | | 12016 |
| | Навес | | 11987 |
| | Котельная с дымовой трубой | | 11992 |
| | Водопровод | | 11623 |
| | Забор | | 11982 |
| | Забор | | 11983 |
| | Забор | | 11986 |
| | Забор | | 11622 |
| | Ворота | | 11984 |
| | Ворота | | 11985 |
| | Мощение | | 11621 |
| | Одноэтажное дощатое административное здание, площадь 102 кв. м | 412/С-12608 | 11620 |
| | Объекты озеленения | | 11803 |
| | Объекты озеленения | | 11804 |
| | Объекты озеленения | | 11805 |
| | Объекты озеленения | | 11807 |
| Сведения о земельном участке | кадастровый номер 424050100012000004, площадь 0,5700 га<br>кадастровый номер 424050100013000004, площадь 0,7100 га | | |
| Местонахождение продаваемого имущества | Гродненская область, Мостовский район, г. Мосты, ул. Занеманская, д. 54 | | |
| Начальная цена | 712 527 200 белорусских рублей без учета НДС | | |
| Сумма задатка | 70 000 000 белорусских рублей | | |
| Сведения об обременениях | договор аренды от 01.04.2009 (арендуемая площадь 12,3 кв. м);<br>договор аренды от 20.02.2009 (арендуемая площадь 305,6 кв. м, 21,0 кв. м)<br>договор аренды от 01.04.2006 (арендуемая площадь 189 кв. м) | | |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Заявитель, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится **02 ноября 2010 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 04.10.2010 по 29.10.2010 включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00** (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**

**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск);**

**(017) 278 35 35, ОАО «ТД «Белресурсы» (ул. Казинца, 2, 220099, г. Минск).**

# ІНШЫЯ. І НЕ ЧУЖЫЯ

Прэс-тур

**ЛЕС, высокі плот і шлагбаум на ўваходзе — гэтае месца не для цікаўных ды і, уласна кажучы, «пабочныя асобы» імкнуцца абыходзіць яго бокам. Па вельмі простай прычыне: тут, бліз вёскі Каменка, амаль на ўскрайку Бабруйска, знаходзіцца адзін з буйнейшых у краіне інтэрнатаў для псіханеўралагічных хворых. Сёння ў ім жыве 360 чалавек. Прычым жыве пастаянна: у адрозненне ад іншых сацыяльных устаноў, сюды трапляюць толькі назаўсёды.**

### «СТРАХОЎКІ» НЕ МАЕ НІХТО

Разумовая адсталасць, эпілепсія, шызафрэнія, хвароба Альцгеймера. Дыягназ у кожнага свой. Як і шлях у гэтую ўстанову. У некага хвароба праявілася з дзяцінства, але да большасці ўсё ж прыйшла з узростам. Адны атрымалі цяжкую чэрэпна-магзавую траўму ў побыце, другія пацярпелі ў дарожна-транспартных здарэннях, трэція сталі ахвярамі стрэсаў, чацвёртых «зламалі» наркатычныя і таксічныя рэчывы. Нарэшце, тлумачэнне праблем многіх гучыць вельмі проста — старасць.

— Сярод іх ёсць розныя людзі, многія ў ранейшым жыцці працавалі, мелі нібыта прэстыжныя прафесіі — былі настаўнікамі, урачамі, спартсменамі, — заўважае дырэктар Каменскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната Галіна Саўчанка. — Словам, некалі ў іх было ўсё, але раптам — не засталося нічога. І, напэўна, толькі тут пачынаеш добра разумець: ад бяды ніхто і ніколі не застрахаваны.

Зноў жа многія мелі сем'і. Прычым казаць аб гэтым выпадае менавіта ў мінулым часе. Бо звычайна бывае так: першым часам пасля змяшчэння ў інтэрнат сваякі прыязджаюць «у адведкі» як мінімум раз у месяц. Потым — раз у год. А затым візіты спыняюцца. «Праблема» пакрысе забываецца. Безумоўна, у правілах сустракаюцца выключэнні, ёсць прыклады, калі дзеці забіралі сваіх бацькоў «на пабыўку» дадому. Аднак звычайна ўжо праз два-тры тыдні вярталі назад. І тлумачэнне тут адно — вытрымаць больш працяглае суіснаванне з невылечна хворым чалавекам сапраўды цяжка.

— Сярэдні ўзрост жыхароў інтэрната перавышае 60 гадоў, а ёсць і тыя, каму далёка за 80, — распавядае Галіна Саўчанка. — Прычым некаторыя знаходзяцца тут дзесяцігоддзямі. Бо, як тое ні сумна, але трэба хіба што канстатаваць: альтэрнатывы гэтаму па-сутнасці няма, адсюль ужо не «выпісваюцца».

### ГАЛОЎНЫЯ ЛЕКІ — СПАКОЙ

Гэта той самы выпадак, калі медыкі вымушаныя разводзіць рукамі. Вылечыць каго-небудзь з жыхароў гэтага інтэрната ўжо немагчыма. Таму галоўная задача гучыць даволі проста — зрабіць усё, каб папярэдзіць развіццё хваробы. І часам не зусім стандартнымі метадамі.

— Сёння няма праблем са сродкамі на лекі, мы можам прапанаваць усе неабходныя медыцынскія паслугі — ад фізіялячэння да стаматалогіі, — распавядае Галіна Саўчанка. — Аднак гэтага — недастаткова. Таму для вырашэння «адвечных» праблем пажылых людзей з верхнімі дыхальнымі шляхамі мы адчынілі ўласны кабінет спелеалячэння ці лячэння соллю, а для паляпшэння агульнага імунітэту зрабілі «сцяжыну здароўя» — жыхары інтэрната могуць пахадзіць басанож па шчабёнцы, пяску, абгабляваным дрэве. А плюс да таго мы прапануем гарбату з самых розных гаючых траў і лячэнне пахамі мяты ці лаванды. Пры гэтым і фітабар, і араматэрапія з'явіліся зусім не выпадкова: яны дапамагаюць пры бяссонніцы, заспакойваюць і, што асабліва неабходна, здымаюць раздражнёнасць.

### ПРАЦАВАЦЬ НЕ ДЗЕЛЯ ГРОШАЙ

Праблема дэфіцыту медыкаў адчуваецца паўсюль, і дамы-інтэрнаты — таксама не выключэнне. Аднак у гэтым выпадку «кадравае пытанне» не абмяжоўваецца выключна прадстаўнікамі аховы здароўя. Умовы для працы тут цяжкія ў чыста псіхалагічным плане. А заробкі — не самыя вялікія. І гэтая «нестыкоўка» адыгрывае значную ролю, асабліва ў наваколлі буйнога горада, дзе амаль заўсёды ёсць іншыя варыянты ўладкавання.

— Калі хтосьці з супрацоўнікаў вырашае звольніцца, то гэта заўсёды непрыемна, але неяк крыўдзіцца ні ў якім разе нельга: у каго не хапае спагады і вытрымкі — таму на самай справе лепш за ўсё сысці ў іншае месца, — зазначае Галіна Саўчанка. — Бо тут, апроч асноўных абавязкаў, даводзіцца быць і выхавацелем, і нянечкай, і суддзёй. Неабходна рабіць усё, каб жыхары інтэрната адчувалі сябе так, як дома. Вядома, нам выдзяляюцца грошы, толькі за апошні час патрапіла адрамантаваць сталоўку і абнавіць мэблю. Вось толькі фінансаванне вырашае не ўсё — многае трэба рабіць выключна ўласнымі сіламі.

Чамусьці распаўсюджаная думка, што жыхарам псіханеўралагічнага інтэрната «амаль нічога не патрэбна» — безумоўна, памылка. Так, у іх здараюцца зрывы. Але гэтая з'ява часовая. У астатнім жа яны практычна такія, як і мы — толькі крыху з іншым успрыняццем свету.

— Як і нам, ім вельмі патрэбны камфорт, насуперак усім стэрэатыпам, яны ўмеюць цаніць прыгажосць — некаторыя з жыхароў інтэрната, без перабольшання, з'яўляюцца нават таленавітымі мастакамі, — адзначае Галіна Саўчанка. — І, апроч таго, ім неабходныя заняткі — кнігі, газеты, шахматы, шашкі, трэнажорная зала, настольны тэніс, футбол, праца. Натуральна, што прымушаць кагосьці працаваць тут нельга. Але хто мае сілы і каму дазваляе здароўе — імкнецца штосьці рабіць сам. Мы вырошчваем бульбу, капусту, буракі і моркву, маем уласны вялікі сад. Жыхары інтэрната могуць дапамагаць у пральні, даглядаць свойскую жывёлу. Бо ў любым выпадку праца дае шанц разнастаіць жыццё. А для людзей, якія ўвесь час знаходзяцца на адной і той жа зачыненай тэрыторыі, гэта надзвычай важна.

А яшчэ сёння на тэрыторыі інтэрната, дзякуючы збору добраахвотных ахвяраванняў, вядзецца будаўніцтва званіцы. Прычым яна зноў жа найперш неабходная хворым. Каб была магчымасць наблізіцца да Бога. І каб яны маглі вучыцца цярплівасці і павазе да тых, з кім выпала жыць побач.

### ЧАРГА ЗАСТАНЕЦЦА Ў МІНУЛЫМ

Сёння на тэрыторыі Беларусі налічваецца больш за сем дзясяткаў дамоў-інтэрнатаў, 9 з іх разлічаныя на дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, 19 — для ветэранаў і інвалідаў, а 44 — для асоб з псіханеўралагічнымі захворваннямі. У цэлым у стацыянарных установах пражывае 17,1 тысячы чалавек, прычым попыт на «дзяржаўнае ўтрыманне» не змяншаецца. А адным з галоўных застаецца пытанне... дэфіцыту плошчаў. І асабліва актуальная яна менавіта для асоб з парушэннямі псіхікі.

Між тым, паводле слоў намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціны Каралёвай, пэўныя зрухі тут ёсць. За апошнія час чарга на размяшчэнне ў дамы-інтэрнаты зменшылася з 1370 да 764 чалавек, у стацыянарных установах значна палепшыліся ўмовы пражывання, інтэрнаты паступова пазбаўляюцца «перанаселенасці». Пры гэтым саму праблему «недахопу месцаў» плануецца вырашыць цягам бліжэйшых гадоў.

**Сяргей ГРЫБ.**

*Мінск — Бабруйск.*

# Стратаў магло б не быць

**Калегія Камітэта дзяржаўнага кантролю Мінскай вобласці прааналізавала прычыны стратнасці прадпрыемстваў Міншчыны і паставіла задачу пераламаць сітуацыю.**

Сёлета па выніках сямі месяцаў 105 прадпрыемстваў і арганізацый Мінскай вобласці з'яўляюцца стратнымі. Гэта менш, чым летась (сума стратаў увогуле зменшылася ўдвая), але і гэтай лічбы магло б не быць, калі б кіраўнікі ўсіх прадпрыемстваў навучыліся лічыць грошы. Пра гэта заявіў **старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Мінскай вобласці Уладзіслаў ЦЫДЗІК** на калегіі, прысвечанай аналізу эфектыўнасці мераў, якія прымаюць органы ўлады па зніжэнні стратнасці прадпрыемстваў і арганізацый цэнтральнага рэгіёна Беларусі.

Асноўнымі прычынамі стратнасці з'яўляюцца недастатковыя аб'ёмы выпуску прадукцыі, неэфектыўныя меры па зніжэнні сабекошту і эканоміі, несвоечасовае спагнанне дэбіторскай запазычанасці, нізкая канкурэнтаздольнасць, недастатковая праца па пошуку рынкаў збыту, а таксама нізкая фінансавая і выканаўчая дысцыпліна службовых асобаў.

Амаль палова стратных суб'ектаў гаспадарання прыпадае на прамысловыя прадпрыемствы вобласці. Але самае, бадай, дзіўнае, што ў наш час будаўнічага буму на Міншчыне аказалася стратнай і амаль кожная 10-я будаўнічая арганізацыя.

У сумнай статыстыцы вылучыліся Мінскі, Маладзечанскі і Барысаўскі рэгіёны, на якія прыпала больш за палову ўсіх стратных прадпрыемстваў вобласці. Так, чыстыя страты на пачатак жніўня гэтага года ЗАТ «Слаўнафта-Старт» (Мінскі раён) склалі 11,7 млрд рублёў, свінакомплексу «Барысаўскі» — 8,7 млрд, РУП «Маладзечанскі завод металаканструкцый» — 2,9 млрд руб.

— Але мы павінны не канстатаваць факты, а лячыць хваробу, — падкрэсліў старшыня Камітэта. — Дзейнасць некаторых камерцыйных прадпрыемстваў носіць крымінальны характар. Напрыклад, вядомыя выпадкі, калі ўладальнікам і прадпрыемства-вытворцы, якое знаходзіцца ў Беларусі, і прадпрыемства-заказчыка, якое знаходзіцца за межамі краіны, з'яўляецца адна і тая ж асоба. Разлік за прадукцыю не адбываецца своечасова, у выніку чаго вымываюцца асноўныя сродкі, валютная выручка не вяртаецца ў Беларусь.

Яшчэ адна прычына стратнасці некаторых камерцыйных прадпрыемстваў — хаванне прыбытку дзеля пазбягання выплаты падаткаў.

У сувязі з гэтым калегія Камітэта дзяржкантролю вобласці пастанавіла сумесна з інспекцыяй Міністэрства па падатках і зборах Беларусі актывізаваць працу па вызначэнні схемаў вымывання зваротных сродкаў шляхам адгрузкі прадукцыі з мінімальнай рэнтабельнасцю, без папярэдняй аплаты і на доўгі тэрмін прадпрыемствам з адным і тым жа заснавальнікам. Падатковаму міністэрству прапанавана таксама распрацаваць механізмы, якія прадухілялі б магчымасць хавання прыбытку.

Пра павышэнне персанальнай адказнасці кіраўнікоў за эканамічны стан стратных прадпрыемстваў размова на калегіі ішла асобна.

Некаторыя кіраўнікі тлумачылі немагчымасць змяніць сітуацыю тым, што банкі адмаўляюць у крэдытах, або тым, што цяжар ўжо ўзятых крэдытаў надта вялікі.

— Так, банкі сёння адвярнуліся ад стратных прадпрыемстваў, і гэта правільна, бо банку патрэбна забеспячэнне крэдыту, — пракаментавала «Звяздзе» сітуацыю **начальнік упраўлення кантролю галін гаспадаркі і грашова-крэдытнай сферы Камітэта Дзяржкантролю Мінскай вобласці Валянціна ЗЯЗЮЛЬКІНА.** — Стратнае прадпрыемства не толькі не можа ўзяць новы крэдыт, яно не можа атрымаць у банку больш лаяльныя ўмовы фінансавання, афармлення акрэдытываў, атрымання авансаў.

Кожны суб'ект гаспадарання павінен добра ўсведамляць, што ад банкаўскай дапамогі зыходзіць дзве небяспекі: павялічваецца сабекошт прадукцыі з-за працэнтаў па кароткіх крэдытах, і з'ядаецца прыбытак з-за доўгіх. Пазычаныя сродкі для суб'екта гаспадарання заўсёды нявыгадныя. Хоць для інвестыцый сабраць грошы вельмі цяжка, але кожны павінен разлічваць у першую чаргу на свае сілы. Плацежаздольнасць суб'ектаў гаспадарання заўсёды пагаршаецца з-за ўзятых крэдытаў.

***— Колькі са 105 стратных на сёння прадпрыемстваў Мінскай вобласці здольныя выправіць сітуацыю сваімі сіламі?***

— Каля 10 прадпрыемстваў маюць рэальную магчымасць выйсці на бясстратную работу да канца года. 90 прадпрыемстваў рэальна па сённяшняй сітуацыі наўрад ці змогуць пераадолець сваю стратнасць сёлета. Задача Камітэта дзяржаўнага кантролю Мінскай вобласці ў тым, каб прадухіліць пагаршэнне сітуацыі. Мы пытаемся ў кожнага кіраўніка: што ты зрабіў, каб пры тваёй уладзе стала лепш? Мэта сённяшняй калегіі — пераламаць сітуацыю са стратнымі прадпрыемствамі. Каб кіраўнікі не думалі, што яны маюць права і далей пасіўна падаць у даўгавую яму. Бо вынік стратнасці — банкруцтва.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## Пытальнік

# Вы не выйгралі ў розыгрышы, але дапамаглі іншым

*Дарагая рэдакцыя! Адкажыце мне, калі ласка, праз газету: дзе мне праверыць латарэйны білет «Міласэрнасць» ад 26 жніўня? Розыгрыш адбыўся, а я не магу праверыць вынік. Начальнік аддзела давала мне табліцу, але я не разабраўся ў ёй.*

**Мікалай МІКАЛАЕВІЧ МЫЧКО,** *г.Ельск*

Заснавальнікам рэспубліканскай тыражнай пасіўнай латарэі «Міласэрнасць» з'яўляецца Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Розыгрышы прызавога фонду тыражоў латарэі праводзяцца не радзей за два разы ў год. Мэтамі правядзення латарэі з'яўляюцца, у прыватнасці, закупка спартыўнага рыштунку і абсталявання, спартыўнай формы, трэнажораў, медыцынскага абсталявання для стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання, рэспубліканскага цэнтра для дзяцей-інвалідаў, дзяржаўных устаноў: «Рэспубліканскага санаторыя «Белая вежа» для ветэранаў вайны, працы і інвалідаў», «Рэспубліканскага санаторыя «Бярэзіна» для ветэранаў вайны, працы і інвалідаў», «Рэспубліканскага санаторыя «Вяжуці» для інвалідаў з парушэннямі апорна-рухальнага апарату», «Рэспубліканскага санаторыя «Ясельда» для ветэранаў вайны, працы і інвалідаў».

Так што, Мікалай Мікалаевіч, не засмучайцеся, што вам не пашчасціла на гэты раз (мы праверылі ваш білет па пакінутым яго нумары і серыі): ваш грашовы ўклад пайшоў на добрую справу. А самастойна праверыць вынікі розыгрышу пры жаданні вы можаце, напрыклад, на сайце па адрасе: belloto.by\tiraz-loto\milaserdnast (дастаткова ўвесці вышэйназваныя нумар і серыю білета).

# ГОРА-МІНЁРКА

Ну і ну!

У 11 гадзін 38 мінут 30 верасня ў Жабінкаўскае аддзяленне «Белінвестбанка» паступіў званок і ўсхваляваны жаночы голас паведаміў, што будынак замініраваны. У банк па вуліцы Свабоды тут жа прыбылі супрацоўнікі міліцыі, МНС, КДБ, спецыялісты па размініраванні. Работнікаў банка ў тэрміновым парадку эвакуявалі. Але ніякіх падрыўных устройстваў выяўлена не было. Міліцыянеры вылічылі «мінёрку». Ёю аказалася 40-гадовая жыхарка вёскі Шпіталі. Маці дваіх дзяцей пакрыўдзілася на банк за невялікія працэнты па яе ўкладзе і вырашыла адпомсціць такім вось чынам. Цяпер, каб заплаціць штраф, невядома, ці хопіць ёй і ўкладу, а не толькі працэнтаў.

**Яна СВЕТАВА.**

Утерянные бланки страховых полисов серии ББ №№ **0175834, 0175836**; серии НС №№ **0210370, 0217068, 0187630—0187632, 0216648—0216649**, принадлежащие ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», считать недействительными.

**УНП 101063229**

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 03 ноября 2010 года ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже принадлежащего ОАО «Крион» (продавец) здания специализированного животноводства (здание коровника) с инв. номером 620/С-24926, общей площадью 1847,1 кв. м, расположенного по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Дзержинский р-н, Негорельский п/с, около дер. Павловщина. Площадь земельного участка 0,9550 га, инв. номер 622200000001000887.**

Начальная цена – 103 517 500 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 10 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за объект продажи. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта продажи осуществляется в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **03 ноября 2010 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 04.10.2010 по 01.11.2010 в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45)** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск);**
**(017) 275 22 81 – ОАО «Крион» (ул. Серова, 8, 220024, г. Минск).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРОДАЖУ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Аукцион состоится **01.11.2010 в 11.00** по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. № 204.
Организатором аукциона является РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, находящегося по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А.

**На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:**

| Адрес арендуемого имущества | Площадь, кв.м | Предполагаемое целевое использование | Коэффициент от 0,5 до 3,0 | Начальная цена продажи | Размер задатка | Срок договора аренды | Характеристика |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| Здание АТС, помещения на 1-м этаже, расположенные по адресу: г. Гродно, ул. Горького, 87. | 157,33 (16,3; 13,5; 94,23; 3,2; 27,1; 0,8; 0,8; 0,7; 0,7) | Под размещение офисов, магазинов, производственных площадей (за исключением вредных производств) | 3,0 | 1 376 638 | 137 664 | 3 года | Помещения расположены на 1-м этаже 4-этажного здания. Имеется естественное освещение, центральное отопление, электроснабжение, водоснабжение, канализация, телефонизировано. |

Документы на участие в аукционе принимаются **с 04.10.2010 по 26.10.2010 в рабочее время (с 9.00 до 16.00)** по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. 202. Документы, поданные после 16.00 26.10.2010 не рассматриваются.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на с/с 3012000000225 в филиале 426 АСБ «Беларусбанк» код 199, УНП 500826567 Гродненский филиал РУП «Белтелеком»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо – резидент Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Телефоны для справок: (0152) 43 25 71, 48 65 95, факс (0152) 72 02 07.**

## Извещение о проведении 03 ноября 2010 года открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Гроднооптторг»:

| | |
|---|---|
| Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота | - здание магазина с бытовой комнатой, инв. номер 452/С-5039,общая площадь 154,6 кв.м;<br>- здание склада с гаражом, инв. номер 452/С-5040, общая площадь – 93,2 кв. м;<br>- здание уборной, инв. номер 452/С-5038, общая площадь – 0,9 кв.м;<br>- ограждение (металлическая сетка по бетонным столбам), протяженность – 146,4 м.п.;<br>- ворота;<br>- калитка;<br>- асфальтобетонное покрытие, площадь – 1439 кв.м. |
| Местонахождение имущества | Гродненская область, Зельвенский район, г.п. Зельва, ул. Гагарина, д. 75 |
| Сведения о земельном участке | площадь – 0,2305 га, кадастровый номер 422655100001000807; назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений Зельвенского участка оптовой торговли |
| Сведения о продавце | ОАО «Гроднооопторг», ст. Лососно, 230001, г. Гродно, телефоны (0152) 55 39 12, (044) 794 61 35 |
| Сведения об организаторе аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 227 48 36 |
| Начальная цена с учетом НДС | 75 336 000 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 7 500 000 белорусских рублей |
| Сведения об обременениях | аренда |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за объект продажи. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта продажи осуществляется в срок, указанный в договоре купли-продажи по согласованию с продавцом. Аукцион состоится **03 ноября 2010 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 04.10.2010 по 01.11.2010 включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45)** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36, (0152) 55 39 12, (044) 794 61 35.**

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже здания автогаража гражданам Республики Беларусь в частную собственность:

НАИМЕНОВАНИЕ, МЕСТОПОЛОЖЕНИЕ, ЦЕЛЕВОЕ НАЗНАЧЕНИЕ ОБЪЕКТОВ.

■ Здание автогаража, общая площадь 274,2 $м^2$ (инвентарный № 631/С-58647) с земельным участком площадью 0,2632 га (кадастровый номер 621385412101000130), расположенного по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, д. Шиловичи, ул. Советская, 9, с начальной ценой 33 100 000 белорусских рублей. Шаг аукциона установлен в размере 10 % от предыдущей цены.

ПРОДАВЕЦ – Открытое акционерное общество «Вилейский Райагросервис».

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – СИКУП «УКС-СЕРВИС».

СУММА ЗАДАТКА – 5 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, получатель платежа: СИКУП «УКС-СЕРВИС».

ФОРМА, УСЛОВИЯ ОПЛАТЫ – платеж в размере цены приобретения объекта за вычетом суммы задатка на р/с № 3012201820012 в отд. ОАО «Белагропромбанк», г. Вилейка, код 903, получатель платежа: ОАО «Вилейский Райагросервис»; УНН 600010756, ОКПО 01793926, согласно протокола аукциона, в течение 2 месяцев 25 дней со дня получения протокола аукциона.

СУММА КОМПЕНСАЦИИ ЗАТРАТ НА ОРГАНИЗАЦИЮ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНА: согласно протокола аукциона, в течение 5-ти рабочих дней на р/счет СИКУП «УКС-СЕРВИС».

ДОКУМЕНТЫ, ПРЕДОСТАВЛЯЕМЫЕ ДЛЯ УЧАСТИЯ В АУКЦИОНЕ – заявление на участие, заверенная банком копия платежного документа на внесение задатка; физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, юридическим лицам – копия учредительных документов и свидетельства о регистрации, заверенные нотариально, доверенность, выданная представителю юридического лица.

КОНЕЧНЫЙ СРОК ПРИЕМА ЗАЯВЛЕНИЙ – **27.10.2010** г. до 16.00.

АДРЕС, ПО КОТОРОМУ ПРИНИМАЮТСЯ ЗАЯВЛЕНИЯ – г. Молодечно, ул. Мира, д. 15, к. 1.

ДАТА, ВРЕМЯ, МЕСТО И ПОРЯДОК ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА – **02.11.2010** г. в 14.00 по адресу: г. Молодечно, ул. Мира, д. 15, к. 1.

Аукцион состоится при наличии не менее двух участников на один лот.

**Тел. для справок: 8 (0176) 73 00 13, 75 16 09, 8 (044) 710 74 60.**

## Агракамбінат «Ждановічы»

# «ПОПЫТ НА АГАРОДНІНУ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА — ТРЭБА РАЗВІВАЦЦА ДАЛЕЙ»



1

**Адшумелі рэспубліканскія «Дажынкі», якія ўжо сталі сапраўдным святам для хлебаробаў краіны, ды і ўвогуле для ўсіх сельскіх працаўнікоў. У краіне намалацілі амаль 7,5 мільёна тон збожжа, ды яшчэ чакаецца, што будзе сабрана не менш за 1 мільён тон зерня кукурузы. Не самыя лепшыя ўмовы надвор'я сёлета хоць трохі і «скарэктавалі» адпаведныя прагнозы, тым не менш, не надта паўплывалі на канчатковыя вынікі працы хлебаробаў, на вынікі дзейнасці сельскіх працаўнікоў практычна ва ўсіх сферах раслінаводства. У шэрагу лепшых гаспадарак, прадстаўнікоў якіх ушаноўвалі на рэспубліканскіх «Дажынках», вылучаны і агракамбінат «Ждановічы». Гэтая гаспадарка, добра вядомая ў першую чаргу буйнамаштабнай вытворчасцю сваёй цяплічнай прадукцыі, упэўнена развіваецца і ва ўсіх іншых сельскагаспадарчых кірунках: яна, па сутнасці, стала ў краіне адной са школ перадавога сельскагаспадарчага вопыту. Агракамбінат «Ждановічы» назвалі пераможцам на раённых «Дажынках». Яго прадстаўнікі — старшыя камбайнеры Віктар Пятровіч, які намалаціў каля 3 тысяч тон збожжа, і Алег Голуб (больш за 2 тысячы тон) — сталі ўдзельнікамі ўрачыстасцяў на рэспубліканскіх «Дажынках» у Лідзе.**





2

Што ўяўляюць сёння сабой «Ждановічы»? На многія кіламетры ўздоўж Мінскай кальцавой аўтамабільнай дарогі цягнуцца палі агракамбіната, 11 тысяч гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў у яго складзе, з іх 9 тысяч гектараў — ворных зямель. І варта прызнаць: гэтая блізкасць да «Ждановічаў» вялізнага горада не надта спрыяе іх гаспадарчай дзейнасці: горад паступова адбірае ўсё новыя і новыя гектары (усяго каля года таму наведваў «Ждановічы», а цяпер ускраіну нельга і вылучыць; нават адміністрацыйны цэнтр «Ждановічаў» амаль што зліўся з новымі шматпавярховымі гарадскімі кварталамі, узведзенымі ў заходнім напрамку Мінска). Горад нярэдка забірае да сябе добрых спецыялістаў; ён вымушае выдаткоўваць немалыя сродкі на ахову палёў гаспадаркі ад набегаў на вырашчаны ўраджай...

А сёлетні ўраджай у «Ждановічах» атрымаўся вельмі нядрэнным. Практычна па ўсіх паказчыках перавысілі працаўнікі гаспадаркі мінулы год, хіба акрамя збожжавых — іх трохі недабралі да ўзроўню мінулага года; у прыватнасці, атрымалі па 52 цэнтнеры з гектара, а летась было 55. Тым не менш агульны збожжавы вал даволі важкі: 25 700 тон. Як расказалі ў гаспадарцы, тут 11 тысяч тон збожжа адправілі на хлебакамбінаты краіны згодна з дзяржзаказам, пакінулі, колькі трэба, у сябе на корм жывёле, а таксама прадаюць збожжа ўсім жадаючым — па 275 рублёў за кілаграм. На ўборцы ўраджаю сёлетняга года добра пашчыравалі многія працаўнікі гаспадаркі — у прыватнасці, намалацілі яго больш чым па 1000 тон 13 механізатараў, а Віктар Пятровіч, як зазначана ўжо вышэй, запісаў на свой рахунак каля 3 тысяч тон.

— Гэты год выдаўся больш складаным? — пытаюся ў галоўнага агранома гаспадаркі Анатоля Шклярэўскага.

— Не будзем спасылацца на ўмовы надвор'я, — адказвае ён. — Так, на ўраджай збожжавых яны крыху паўплывалі. А па ўсіх іншых культурах — якраз усё нармальна. Мы маем неблагія вынікі на ўборцы бульбы (яна ў нас была пасаджаная на 200 гектарах, і ўраджайнасць яе склала больш чым па 300 цэнтнераў з гектара, а на асобных участках мелі і па 450 цэнтнераў), морквы (больш чым па 400 цэнтнераў з гектара), на ўборцы іншых агароднінных культур...

Што спрыяла такім неблагім вынікам? Усе культуры былі пасаджаныя і пасеяныя ў аптымальныя тэрміны, вырошчваліся па сучасных інтэнсіўных тэхналогіях, мелі неабходную колькасць унесеных пад іх угнаенняў, былі адпаведным чынам дагледжаныя і г.д.

Паводле слоў галоўнага агранома, хоць уборачны сезон як быццам і набліжаецца да свайго завяршэння, тым не менш цяперашні час для працаўнікоў «Ждановічаў» такі ж гарачы, якім ён быў і падчас уборкі збожжавых. Палі гаспадаркі ў немалой колькасці, 160 гектараў, былі адведзеныя менавіта пад агародніннныя культуры, або, як называюць апошнія тут, — пад агародніну адкрытага грунту. А якраз уборка агародніны з'яўляецца ці не самым працаёмістым працэсам. Уборка морквы і сталовых буракоў (а пад імі ў «Ждановічах» былі занятыя, адпаведна, 50 і 20 гектараў), практычна завяршылася, убралі сярэднеспелую капусту, якую адразу ж і рэалізавалі; а цяпер у гаспадарцы прыступаюць да ўборкі позняспелай капусты, размешчанай на плошчы 80 гектараў (дарэчы, «Ждановічы» традыцыйна вызначаюцца яе высокай ураджайнасцю — да 700—800 цэнтнераў з гектара). Як ужо бачна, памеры агародніннага поля ў «Ждановічах» — немалыя, і на гэтым таксама адбіваецца блізкасць вялікага горада, які, адпаведна, большай часткай і спажывае ждановіцкую прадукцыю і «апетыты» якога (разам з ростам у ім насельніцтва) працягваюць расці. Штодзённа да 50 тон вырашчанай на полі агароднiннай прадукцыі адпраўляюць працаўнікі «Ждановічаў» (дакладней, адпраўлялі яе на момант наведвання гаспадаркі) у гандлёвую сетку Мінска і яго прыгарадаў. Асобная ўвага — дзіцячым установам, бальніцам, навучальным і іншым установам, Мінскаму аптоваму рынку. На тэрыторыі агароднiннай базы гаспадаркі, куды першапачаткова і паступае ўся прадукцыя, вырашчаная на яе палях, дзейнічае дробнааптовы магазін, праз які могуць атаварыцца аптавікі. Гаспадарка мае таксама шэраг сваіх кропак рознічнага гандлю на рынках горада. Адным словам, хочаце назапасіць на зіму менавіта ждановіцкай агароднiннай прадукцыі, ды таксама бульбы (а ждановіцкай прадукцыі можна цалкам давяраць у любых адносінах — як адносна яе смакавых якасцяў, так і адносна яе нітратнай чысціні; прычым наконт гэтага гарантуе лабараторны кантроль гаспадаркі), наведайце гэтыя гандлёвыя кропкі.

А калі хто і не паспее наведаць іх — вялікай бяды таксама няма: ждановіцкай агароднінай можна будзе атаварвацца ажно да ліпеня наступнага года, або, па сутнасці, да пачатку наступнага агароднiннага сезона.

* * *

І тут самы час расказаць пра тое, як захоўваюць працаўнікі гаспадаркі сваю агародніну. Пры гэтым напачатку адзначым: менавіта захоўванне агародніны было і застаецца для агракомплекса краіны і адпаведных нарыхтоўчых арганізацый адной з найбольш вострых праблем. Словам, вырошчваць яе многія, як быццам, навучыліся, а захоўваць могуць далёка не ўсе. Паводле звестак Міністэрства сельскай гаспадаркі краіны, за апошнія 15 гадоў вытворчасць агародніны павялічылася ў нашай краіне ў 3 разы, цяпер яе збіраюць у цэлым па краіне па 2300—2400 тысяч тон. Але пры гэтым каля 40 працэнтаў губляецца менавіта падчас захоўвання. Зразумела, гэта не зусім радасная для нас арыфметыка... Але ў «Ждановічах» поўнасцю вырашылі гэтую праблему. Гаспадарка мае ва ўласнасці вялізныя па сваёй плошчы складскія памяшканні для захоўвання агародніны, а таксама бульбы. Яны разлічаныя амаль на 12 тысяч тон прадукцыі, прычым тут у апошнія гады рэканструяванае агароднiнасховішча на 2,8 тысячы тон, якое цяпер адпавядае самым высокім стандартам у гэтай сферы, абсталяванае сучасным халадзільным абсталяваннем з аўтаматызаваным кантролем тэмпературнага і вільготнага рэжымаў. «Удакладняць гэтыя рэжымы можна, не заходзячы непасрэдна ў халадзільныя камеры, а з пульта кантрольных прыбораў», — расказваў кіраўнік базы захоўвання сельскагаспадарчай прадукцыі Віктар Дзялец.

Як ужо зразумела, галоўная задача агракамбіната «Ждановічы» — забяспечыць мінчан агароднiннай прадукцыяй. І яна няблага выконваецца: штогод у «Ждановічах» закладваюць толькі на захоўванне каля 4 тысяч тон морквы, 5 тысяч тон капусты, 500 тон сталовых буракоў, а таксама каля 4 тысяч тон бульбы.

Падчас наведвання гаспадаркі на яе вытворчай базе якраз прымалі з поля бульбу. Пры гэтым на спецыяльнай сартавальнай машыне адбіраліся асобна пасяўны матэрыял, асобна бульба для продажу, адкідвалася пашкоджаная і г.д. Адным словам, тая бульба, якая накіроўвалася на захоўванне, як адзначыў Віктар Дзялец, поўнасцю адпавядала патрабаванням пэўных стандартаў. Бульбу ж, якая адразу адпраўлялася ў гандаль, на базе фасавалі ў сеткі.

— А хутка, як набудзем ужо іншую лінію, мы будзем бульбу перад адпраўкай у гандаль яшчэ і мыць, — паведаміў Віктар Дзялец. — Добрая прадукцыя павінна мець адпаведны таварны выгляд, і гэтаму аспекту ў агракамбінаце таксама надаецца вельмі пільная ўвага.

* * *

Чым яшчэ заклапочаныя цяпер у «Ждановічах»? Тут прыступілі да ўборкі цукровых буракоў, займаюцца таксама ўборкай кукурузы, прычым зерня мяркуюць атрымаць па 100 цэнтнераў з гектара. У гаспадарцы ўжо завяршылі сяўбу азімых культур, заняўшы пад іх 3100 гектараў.

* * *

Агракамбінат «Ждановічы» даводзілася наведваць неаднойчы, і, па сутнасці, кожны раз у ім чакала нешта новае. Так было і на гэты раз. «А не жадаеце адведаць кавуноў?» — запыталіся ў нас і тут жа прапанавалі гэты самы прадукт. Ждановіцкі, вырашчаны непасрэдна ў самой гаспадарцы, і ён нічым не адрозніваўся ад яго паўднёвых суродзічаў.

Вырошчванне кавуноў стала для гаспадаркі ў сёлетнім годзе свайго роду эксперыментам. У Беларусі яшчэ крыху раней з'явіліся першыя эксперыментатары па вырошчванні кавуноў, але яны былі, як правіла, з нашых «паўднёвых шыротаў». Карацей кажучы, у «Ждановічах» таксама вырашылі паспрабаваць і пасеялі кавуны на невялікай плошчы — каля трэцяй часткі гектара. Атрымалася няблага, прычым і па сваіх вагавых характарыстыках ждановіцкія кавуны нядрэнна паказалі сябе. Праўда, яны пакуль што не ў продажы — разышліся па розных выставах. Тым не менш першы вопыт ёсць, і ў наступным годзе на іх збіраюцца звярнуць большую ўвагу. А яшчэ мяркуюць наконт адпаведнага эксперыменту з дынямі. І няхай з імі таксама няблага атрымаецца, бо калі замежныя кавуны яшчэ даступныя для нашага масавага пакупніка, то з дынямі ў гэтых адносінах, варта прызнаць, намнога цяжэй.

* * *

Аднак кавуны з дынямі — гэта ўсё ж, па сутнасці, экзатычныя для нашай сельскагаспадарчай вытворчасці прадукты. Ва ўсякім разе, на сённяшні дзень. А вось вырошчванне садавіннай прадукцыі — сапраўды рэальная справа. І, увогуле, варта сказаць: некалі ў Беларусі ўдзялялі гэтай справе належную ўвагу. Ды з цягам часу закінулі яе, палічылі, што вытворчасць збожжа ды малака з мясам — гэта намнога важней, чым вытворчасць «вітамінаў». Усё гэта, безумоўна, так. Але ж і вітаміны патрэбныя...

Карацей кажучы, заклалі ў «Ждановічах» гадоў каля 5—6 таму сад, які цяпер займае плошчу ў 115 гектараў. Падышлі да гэтай новай справы з той жа сур'ёзнасцю, з якой займаліся і займаюцца сваімі іншымі справамі: тут і адпаведныя агратэхнічныя прыёмы, і догляд, і г.д. Усё атрымалася вельмі добра. Трэба было паглядзець, якім добрым ураджаем парадавалі працаўнікоў гаспадаркі плантацыі яе садовых дрэў: яблыняў і груш. У прыватнасці, яблыні былі проста ўсыпаныя буйнымі чырванабокімі пладамі. «Пладаносяць толькі другі год, а сёлета знялі ўжо каля 32 тон. А таксама сабралі на сваіх садовых участках нямала клубніц, чорнай парэчкі, алычы, ароніі, — расказваў садавод-аграхімік Сяргей Клімаўцоў... Усяго ж садавіннай прадукцыі знялі сёлета ў «Ждановічах» больш за 80 тон.

І яшчэ можна дадаць да слоў Сяргея Клімаўцова: вельмі смачная прадукцыя вырашчаная ў маладым садзе агракамбіната, прычым яе мяркуецца ўжо ў хуткім часе здымаць па 15 тысяч тон. А таксама варта інфармаваць чытачоў: гаспадарка таксама мае пры сваім садзе гадавальнік і можа прапанаваць вырашчаныя ў ім саджанцы ўсім жадаючым. Не будзе лішнім нагадаць, што цяпер для адпаведных заняткаў у садзе — якраз самы час.

* * *

Агароднiнны сезон практычна падышоў да свайго завяршэння, але толькі не ў цяпліцах агракамбіната, якія тут займаюць каля 26 гектараў. Пра ждановіцкія цяпліцы і іх практычна самую высокую ў краіне ўраджайнасць ужо нямала расказвалася ў шматлікіх выданнях і ў тым ліку ў нашай газеце. Ждановіцкія цяпліцы сталі месцам паломніцтва многіх гасцей гаспадаркі. Сюды прыязджаюць нават галандцы, па тэхналогіях якіх і вырошчвае гаспадарка сваю цяплічную прадукцыю — памідоры ды агуркі. І, напэўна, не варта ў чарговы раз пераказваць перавагі гэтых тэхналогій ды расказваць пра адпаведную руплівасць ждановіцкіх цяплічнікаў. Хіба што нагадаем: у «Ждановічах» у апошнія гады ўведзеныя два новыя цяплічныя комплексы, кожны па 7 гектараў. У цэлым у цяпліцах сабралі ўжо каля 13 500 тон вітаміннай прадукцыі, а сезон яшчэ доўжыцца.

— Недзе ў сярэдзіне лістапада завершым гэты сезон. Пачысцім цяпліцы, грунтоўна падрыхтуем іх да наступнага сезона, а ўжо ў снежні пачнуць набіраць моц новыя расліны. Першая прадукцыя трапіць на сталы жыхароў краіны, і ў першую чаргу мінчан, як звычайна, да 23 лютага, — расказвала наш гід, галоўны эканаміст гаспадаркі Жанна Мончык.

— А музыка ў цяпліцах — гэта таксама частка тэхналагічнага працэсу? — спыталіся мы ў яе.

— Абавязкова, — сур'ёзна адказала яна. — Расліны таксама добра адчуваюць той настрой, з якім іх даглядаюць.

Шчыра сказаць, наконт адпаведнага ўплыву музыкі на расліны — гэта, можа, і занадта. Але вось тое, што даглядаюць іх у «Ждановічах» з адпаведным настроем, гэта значыць добра — тут без сумненняў. У ждановіцкіх цяпліцах з кожнага квадратнага метра здымаюць да 60 кілаграмаў памідораў, (агуркоў — да 70), а ў расадным аддзяленні, дзе кругласутачна гарыць электрычнае святло, — нават да 100 кілаграмаў. Ураджайнасць — адна з самых высокіх у краіне, а што датычыцца агульнага валу ждановіцкай цяплічнай прадукцыі — ён, адназначна, самы вялікі ў краіне: у цэлым складае 16 працэнтаў ад усёй цяплічнай прадукцыі, вырашчанай ва ўсіх нашых гаспадарках.

* * *

«Вернемся» на поле, ці, дакладней, звернемся да той праграмы, якую склалі ў агракамбінаце па далейшым развіцці агародніцтва «адкрытага грунту». А гэта праграма, у прыватнасці, прадугледжвае далейшае і даволі істотнае пашырэнне зямельных плошчаў пад усе агароднінныя культуры.

— Горад расце, у цэлым попыт на агародніну павялічваецца — трэба развівацца далей, да таго ж мы ўжо цяпер маем выдатныя памяшканні для надзейнага захоўвання агародніны, будзем рэканструяваць іншыя складскія памяшканні, прызначаныя для гэтага. Вырошчванне агародніны — гэта не проста патрэбная, але і ў цэлым выгадная справа, яна мае добрую рэнтабельнасць, — падкрэслівалі ў гаспадарцы.

Распрацавалі тут і адпаведную праграму па бульбе. «Пасяўныя плошчы пад бульбу таксама будзем пашыраць. Яна сёлета ў добрай цане, асабліва ў расійскіх гарадах, — падкрэслівалі ў гаспадарцы. — Увогуле, агародніны і бульбы павінны экспартаваць сёлета да 30 працэнтаў, мяркуем на гэтым добра зарабіць».

* * *

У апошнія выхадныя наведаўся ў «Ждановічы», каб сёе-тое ўдакладніць. Каля ўезду на машынны двор стаяла група працаўнікоў гаспадаркі, апранутых па-паходнаму. Запытаўся: «У грыбы?». «Ды якія грыбы — на поле, на ім яшчэ працы хоць адбаўляй», — адказалі мне.

Карацей кажучы, хоць і адсвяткавалі ўжо рэспубліканскія «Дажынкі», а ўборачная гарачая пара ў сельскіх працаўнікоў працягваецца.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**

УНП 600049705.





3

**Агракамбінат «Ждановічы» пераважна спецыялізуецца на вытворчасці цяплічнай прадукцыі і малака. Разам з тым тут масава вырошчваюць агародніну ў адкрытым грунце, а таксама збожжа, рапс, цукровыя буракі, бульбу і іншыя культуры, займаюцца адкормам буйной рагатай жывёлы. У гаспадарцы налічваецца больш за 6 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку больш за 2200 галоў дойнага статку. Адпаведна, з гаспадаркі паступае ў сталіцу і «вялікае» малако (да 40 тон штодзённа). Прычым гэтае малако — высокай якасці; яно адпавядае самым строгім санітарна-гігіенічным і спажывецкім патрабаванням і ў значнай частцы выкарыстоўваецца для вытворчасці дзіцячага харчавання.**



4



5

**Удзельная вага агракамбіната «Ждановічы» ў вытворчасці агародніны закрытага грунту, або агародніны, вырашчанай у цяпліцах, складае 36 працэнтаў па Мінскай вобласці і 16 працэнтаў у цэлым па краіне. У гандлёвую сетку краіны штодзённа на працягу цяплічнага сезона, які доўжыцца ў «Ждановічах» каля 10 месяцаў, паступае да 100 тон агароднiннай прадукцыі «закрытага грунту», пры гэтым немалая частка яе экспартуецца.**



6



7



8

**На здымках:**

**1. У маладым садзе «Ждановічаў», які ўжо пачаў пладаносіць. «Выдатныя яблыкі і грушы знялі сёлета, — адзначае садавод-аграхімік Сяргей КЛІМАЎЦОЎ. — А яшчэ нямала сабралі клубніц, чорнай парэчкі, алычы, ароніі».**

**2. Няспынна працуе ждановіцкі бульбяны канвеер, а бульба, падкрэсліваюць у «Ждановічах», урадзіла сёлета на славу.**

**3. На дварэ ўжо холадна, а ва ўтульных, прасторных ждановіцкіх цяпліцах па-ранейшаму спеюць памідоры. На здымку галоўны эканаміст гаспадаркі Жанна МОНЧЫК.**

**4. «Добрая кукуруза вырасла сёлета ў гаспадарцы», — зазначае яе спецыяліст Аляксандр ВЕРАМЕЙ. Тут сёлета плануюць атрымаць з яе зерня па 100 цэнтнераў з гектара.**

**5. На ўборцы морквы.**

**6. Абедаюць працаўнікі агракамбіната (на яго базе захоўвання сельскагаспадарчай прадукцыі) ва ўласным кафэ.**

**7. Прыгожа выглядаюць дамы катэджнага тыпу, узведзеныя гаспадаркай у вёсцы Гарадзішча.**

**8. Сёлета ў «Ждановічах» упершыню паспрабавалі вырошчваць кавуны. Як бачна па фотаздымку, атрымалася вельмі няблага. Кавуны дэманструе кіраўнік ждановіцкай базы па захоўванні сельскагаспадарчай прадукцыі Віктар ДЗЯЛЕЦ.**

**Фота Аляксандра КРЭНЦЯ.**

# У Пелясе ўшанавалі князя Вітаўта

**У вёсцы Пеляса Воранаўскага раёна паміж будынкамі школы і касцёла Святога Лінаса ўстанавілі помнік вялікаму князю Літоўскаму Вітаўту. Менавіта праз Пелясу 600 гадоў таму праходзіў ягоны шлях з Вільні ў Гродна.**

Ініцыятар гэтага праекта — літоўскі дзяржаўны і грамадскі дзеяч Ізідорус Шымеленіс, падтрымку аказалі аб'яднанне «За грамадзянскае грамадства» (Літва) і пеляскае грамадскае аб'яднанне літоўцаў «Гімціне» («Айчына»). Вышыня скульптуры — каля шасці метраў, скульптар Альгімантас Сакалаўскас выканаў яе з дубу ў тэхніцы літоўскай нацыянальнай разьбы па дрэве. У левай руцэ князь — рыцар з каронай — трымае сімвал улады — скіпетр, а правай абапіраецца на меч.

У той жа дзень у Пелясе адбылася прэзентацыя дакументальна-публіцыстычнага фільма «Літоўцы Беларусі» мінскай відэастудыі «Брэнтстар». Стужка апавядае пра гісторыю і сённяшні дзень літоўскай абшчыны ў нашай краіне, у якой цяпер каля 6400 чалавек, пра яе клопаты па захаванні мовы і нацыянальных традыцый. Аўтар сцэнарыя і рэжысёр фільма — Міхаіл Мілашэўскі, аператар — Сяргей Яноўскі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# І КАРТА НЕ ДАПАМАГЛА

Паводле інфармацыі прэс-цэнтра памежнага камітэта Беларусі, непадалёку ад беларуска-польскай мяжы былі затрыманыя двое грамадзян Грузіі. Маладыя жыхары Тбілісі, якія былі суседзямі, вырашылі трапіць у ЕС, каб там уладкавацца на працу. Прыляцелі ў Мінск, а потым даехалі да Брэста і пасяліліся ў гасцініцы.

Напачатку грузіны наведалі мяжу ў раёне прапускнога пункта «Варшаўскі мост». На кантрольнай паласе яны прымусілі спрацаваць сігналізацыю і вярнуліся ў гасцініцу. Памежнікі шукалі парушальнікаў з дапамогай катара і верталёта. «Госці» з Грузіі думалі, што неўзабаве наступіць цішыня і яны спакойна пяройдуць мяжу. На наступны дзень грузіны купілі карту Брэста і падаліся да мяжы. Але ім не пашанцавала. На гэты раз парушальнікаў затрымалі.

# ЦЯЛЯЦІНА І Ў НАС НЕ ПРАПАДЗЕ

Калі драгічынскія міліцыянеры каля в. Новая Попіна зазірнулі ў «Аўдзі-100», якой кіраваў грамадзянін Украіны з Валынскай вобласці, то знайшлі там цяляціны амаль на 17 млн рублёў.

Дакументаў на мяса не было, і яго канфіскавалі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Занатоўкі мастака



### КРЫЎДА НА СЯБЕ

Спусціўся на эскалатары ў метро, а цягнік адыходзіць... Крыўда неверагодная! Ну мог бы крыху шыбчэй ісці? Мог! Ну мог бы не стаяць на сходах і не чытаць рэкламныя абвесткі на шчытах? Мог бы! Ну каб крышачку пазней пачуў «асцярожна...», дык і паспеў бы, і зараз бы ехаў, а так стаіш і перабіраеш варыянты затрымак. Злуешся на сябе, на цягнік, на ўвесь падземны свет. Вядома, будзе наступны цягнік. Ён ужо ідзе. Колькі там таго чакання? І ўсё ж крыўдна. І крыўда тая не праходзіць нават тады, калі ты сеў у вагон і спакойна едзеш.

### КРОПЛЯ ПРАЎДЫ

Наяўнасць натуралістычных вобразаў у творах мастацтва патрабавалася таталітарным рэжымам, каб пераконваць даверлівыя народныя масы ў праўдзівасці фантастычных ідэй. Стварэнне звышчалавека, стварэнне савецкага чалавека, стварэнне еўразійца — толькі некаторыя з тых псеўдавялікіх ідэй, што вымагалі ад прапагандыстаў і прапагандыстак дэмагагічнага балбатання пра рэалістычнае мастацтва.

### РАБЫ І АГОНЬ

З яго няма чаго ўзяць... Нібыта і чалавек, нібыта і працуе, але ўзяць няма чаго. Выканаўца чужое волі. З такім сумна і небяспечна, бо ўвесь час трэба быць напагатове. Каб чаго не сцягнуў, каб чаго не скраў, каб шкоды не нарабіў. Раб! Такія заўжды шкодзілі. Здавалася б, чалавецтва даўно пазбылася рабства і рабоў. Знешне яно так і выглядае, але рабы засталіся. І гэтых рабоў шмат, іх значна болей, чым рабаўладальнікаў. З рабамі мне нецікава, як і малацікава з рабаўладальнікамі. Мне цікава жыць з людзьмі вольнымі, але іх не адразу і знойдзеш.

### ЖАНЧЫНА І ЧАРНАТА

Гарачыня задушлівая. Уночы на горад нахопліваюцца навальніцы, удзень пячэ і парыць. Цяжкасць і стомленасць. Працаваць няма аніякай магчымасці. Сяджу на праспекце пад парасонам і п'ю сабе каву. Кавы п'ю шмат, але санлівасць не адпускае. Бачу: плыве знаёмая жанчына: уся ў чорным, ад акуляраў да паўкедаў. Усе навокал у светлым, а яна адна ў чорным. Уздымаюся, запыняю, кажу: «Што ж гэта ты ўся ў чорным, ад паўкедаў да акуляраў, калі варта ў светлым хадзіць? Трэба ў белым, а ты ў чорным!» — «А каб розныя...» Яна расхінула на грудзях чорную кофту, а пад ёю я пабачыў чорную майку. «Бачыў?» — «Не! А што я мусіў тамака пабачыць? Чорная майка...» — «У мяне няма прадмета жаночай гордасці. Мне няма чым ганарыцца. Цыцкі няма! Адрэзалі мне цыцку!» — «Даруй!» — «Паспрабую, калі атрымаецца...» Задуха ў горадзе такая, што ад яе ў вачах цёмна робіцца.

### МАМА І ЛІШАК ВАГІ

Паскардзіўся маці, што, кінуўшы паліць, набраў лішнія сем кілаграмаў. Мама паспачувала і распавяла, як таксама, кінуўшы паліць, пачала набіраць вагу: «Каб яшчэ наш тата, мой Чэсь, быў жывы, дык дзеля яго скінула б вагу. А так... Мне было ўсё адно, як я выглядаю. Цяпер я даглядаю сябе, каб хадзіць і нікога не турбаваць сваёй прысутнасцю ў гэтым свеце». Мама, як і заўжды, мела рацыю. Мы глядзім сябе дзеля іншых, а не дзеля сябе. Нам бы і хацелася, каб дзеля сябе, а ўсё адно мы скідваем вагу, кідаем піць і курыць дзеля іншых.

### ПОСТМАДЭРНІЗМ І ТАТАРЦЫ З ГРУЗІНЦАМІ

Убачыў слова «абстракцывізм» замест звыклага «абстракцыянізм». Куртатае і штучна зробленае слоўца нагадала мне пра абітурыентак з Малдавіі, якія называлі татараў «татарцамі» а грузінаў «грузінцамі». Калі ўкраінцы і літоўцы, тады татарцы і грузінцы! Так разважалі маладзенькія мастачкі, якіх я вучыў у маскоўскім інтэрнаце асновам архітэктурнай кампазіцыі. Дзяўчаты былі здольнымі, і хутка іх татарцы зрабіліся татарамі, а грузінцы — грузінамі. Каб жа так проста было і ў мастацтвазнаўцаў! Не! Яны постмадэрнізм называюць «постмадэрнам» і не разумеюць, што гэта ж тое самае, як малдаван называць малдаванцамі. Нават горш! Цяпер яшчэ «абстракцывізм» з'явіўся... Смешна. Ад сур'ёзнасці мастацвазнаўцаў мне смешна.

### ЭСТОНСКАЕ РАДЫЁ, КЕПСКАСЦЬ І ДОБРАСЦЬ

Даваў інтэрв'ю эстонскаму радыё. Бакенбарды з эстонскіх радыёхваляў запыталіся: «Як жывецца ў Беларусі беларускаму пісьменніку?» — «Добраму беларускаму пісьменніку ў Беларусі жывецца добра, а кепскаму — кепска!» Рудыя бакенбарды заўсміхаліся насцярожана, не паверылі. Яны не далі веры, што ў Беларусі, як і ва ўсім свеце, кепскія людзі жывуць кепска.

### ПРЫШВІН І СПОРТ

Заўжды адчуваў заганнасць у спартовых гульнях. Захопленасць і азарт не вядуць чалавека да дабра. А ўсялякае спаборніцтва спараджае асляпляльны азарт. Таму я мала займаўся і мала сачу за гульнямі ў спартовых цырках. Так, спорт — мастацтва, прымітыўны тэатр-цырк. У спорта безліч прыхільнікаў, аматараў і заўзятараў. Я іх усіх цудоўна разумею, бо сам неаднойчы спакушаўся гульнямі і спаборніцтвамі. Але я цалкам згодны з Міхаілам Прышвінам, які яшчэ ў 1933 годзе напісаў у патаемным дзённіку такі сказ: «Мяжа спорту і творчасці (спорт амаральны...)».

### НОВЫ ЧАЛАВЕК

Сярод нас з'явіўся новы чалавек з мабільным тэлефонам. Ён не можа супакоіцца, пакуль не адключыць свой сотавік. Адключыўшы мабільнік, неспакойны чэл думае, што з адключанай мабілай ён робіцца спакайнейшы. На нейкі кароткі час, на зусім сціслы тэрмін, чэл і напраўду спакайнее. Але потым пачынае нервавацца ўдвая болей. Чалавек нервуецца моцна, ажно пакуль зноў не ажывіць свой любімы сотавы тэлефон...

### КАВА І МОРА З МАЦІСАМ

Узяў эспрэса ў французскім хлебным. Звычай я ў тым хлебным і выпіваў глыток гарачай кавы, разглядаючы залатыя батоны. А гэтым разам узяў каву ў папяровым кубачку ды пайшоў на бераг мора. Прайшоў пару кварталаў, сеў на крэсла. Глядзеў на марскі далягляд і згадваў жывапісца Анры Маціса. Ён некалі сказаў, што ягонае мастацтва спакойнае і ўтульнае, нібыта ты ўладкаваўся ў фатэлі і выцягнуў ногі. У Маціса выдатнае мастацтва, прасветленае і насычанае міжземнаморскім сонцам. У мяне не атрымліваецца ствараць утульныя творы, але часам я сам у іх трапляю разам з кубачкам эспрэса на беразе вечаровага чароўнага Міжземнага мора.

**Адам ГЛОБУС.**



Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» шчыра віншуе **з 70-годдзем Івана Пятровіча МАКАЛОВІЧА**, былога галоўнага рэдактара газеты. Здароўя Вам, добрага настрою, цеплыні і суладдзя ў стасунках з роднымі і блізкімі людзьмі.



г. ВИТЕБСК 13.10.2010

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 4. | Здание магазина с тремя пристройками, дорожкой, забором и сетями, расположенное по адресу: Витебская область, Миорский район, г. Миоры, ул. Садовая, 1, и право заключения договора аренды земельного участка | **НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНА НА 20 %**<br>**Характеристика объекта недвижимости:**<br>- капитальное строение с инв. № 211/С-8297 (**здание магазина с тремя пристройками, дорожкой и забором**) – кирпичное, фундамент – бутобетонный ленточный, перекрытия – дощатые, крыша шиферная, общая площадь 136,6 кв.м;<br>- капитальное строение с инв. № 254/С-9123 (сооружение специализированное коммунального хозяйства (**хозбытовая канализационная сеть**) – протяженностью 1,1 м;<br>- капитальное строение с инв. № 254/С-9124 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения (**водопроводная сеть**) – протяженностью 12,0 м;<br>- капитальное строение с инв. № 254/С-9125 (сооружение специализированное энергетики (**электрическая сеть**) – протяженностью 15,0 м.<br>**Земельный участок** с кадастровым номером 223350100001000309, площадью 0,0216 га, под здание магазина с офисом, сроком аренды 50 лет. Использование – под объект розничной торговли. | 72 573 906 | 7 257 390 |
| 5. | Объекты производственной базы, расположенные по адресу: Витебская область, Докшицкий район, Крулевщинский с/с, д. Крулевщина, и право заключения договоров аренды земельных участков | **НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНА НА 20 %**<br>**Характеристика объектов недвижимости:**<br>- капитальное строение с инв. № 232/С-16653 (**здание конторы**), кирпичное двухэтажное, 1978 г.п., общ. площадь 421,1 кв.м, объем 1548 куб.м, фундамент бутовый, перекрытия ж/бетонные, крыша совмещенная рулонная; асфальтовое покрытие, площадь 902,46 кв.м, асфальтовая дорожка, площадь 63,54 кв.м, бордюр (бетонные борт), ворота сварные металлические на металл. столбах;<br>- капитальное строение с инв. № 232/С-16654 (**здание гараж-мастерская**), кирпичное одноэтажное, 1979 г.п., общ. площадь 599,8 кв.м, объем 4217 куб.м, фундамент ж/бетонный, перекрытие бетонное, крыша совмещенная;<br>- капитальное строение с инв. № 232/С-16655 (**здание гаражи, проходная**), кирпичное одноэтажное, 1979 г.п., общ. площадь 78,3 кв.м, объем 415 куб.м, фундамент бутовый, перекрытие ж/бетонное, крыша совмещенная, рулонная, забор металл. на металл. столбах, длина 11,5 м;<br>- капитальное строение с инв. № 232/С-16656 (**здание материального склада**), одноэтажное, 1979 г.п., общ. площадь 296,0 кв.м, объем 873 куб.м, фундамент бутовый, наружные стены кирпичные, дощатые, шиферные, крыша шиферная; асфальтобетонная площадка, площадь 840 кв.м, забор ж/бетонный на ж/бетонных столбах, площадь 385 кв.м;<br>- капитальное строение с инв. № 232/С-16673 (**навес**), шиферное одноэтажное, 1979 г.п., площадь 280,5 кв.м, объем 1562 куб.м, фундамент бутовый, крыша шиферная;<br>- сооружение с инв. № 232/С-17532 (сооружение специализированное коммунального хозяйства – **наружная канализация**), протяженность 209,89 м;<br>- сооружение с инв. № 232/С-17533 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – **наружный водопровод**), протяженность 197,68 м;<br>- **зеленые насаждения**: каштан – 2 шт., клен – 1 шт., сирень – 1 шт., туя – 3 шт.<br>**Земельные участки** сроком аренды 99 лет, с кадастровым номером 222183005101000561 под здание конторы, площадью 0,2041 га, и с кадастровым номером 222183005101000562 под объекты производственной базы, площадью 0,6428 га. Использование – под объект общественного назначения. | 260 410 670 | 26 041 060 |
| 6 | Здание специализированное для образования и воспитания, расположенное по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. Островского, 36, и право заключения договора аренды земельного участка. | **Характеристика объекта недвижимости:** Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-29323 – двухэтажное каменное здание учебного корпуса с подвалом, забором железобетонным и металлическими воротами, фундамент бутобетонный, перекрытия железобетонные, крыша совмещенная, общая площадь 1109,7 кв.м.<br>**Земельный участок:** 86/100 доли в праве общей долевой аренды (без закрепления границ на местности) земельного участка площадью 0,1792 га, с кадастровым номером 242400000001004768 для содержания и обслуживания недвижимого имущества, срок аренды 83 года. | 581 254 683 | 58 125 468 |

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail: votfondgi@tut.by.

**1. Аукцион состоится 13 октября 2010 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 12.10.2010 по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 13.10.2010 с 14.00 до 15.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

**4. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 3 миллионов рублей (по каждому лоту), расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

5. Подробная информация об условиях аукционов, порядке участия и проведения аукционов опубликована ранее в газете «Звязда» от 05.08.2009 № 144 (26502), от 17.09.2009 № 175 (26533) и от 18.06.2010 № 117 (26725).

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

### МГ УКП «Центр по приватизации» проводит открытый аукцион 18 октября 2010 г. по продаже оборудования, находящегося на балансе ОАО «Могилевхимволокно»

| № лота | Наименование | Начальная цена продажи без учета НДС, руб. | Сумма задатка, руб. | Характеристика объекта |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Установка получения нетканого полотна № 1 (инв. № 4490088500) | 84 196 030 | 8 419 000 | Установки получения нетканого полотна введены в эксплуатацию в 1988 году. Установленная мощность – 156 кВт. Длина 20-22 м, ширина – 3,5 м, максимальная ширина выпускаемого полотна 260-263 см. Установка получения нетканого полотна предназначена для разрыхления волокна, получения холста, иглопробивания холста и формирования полученного нетканого полотна в рулоны.<br>Техническая документация на установки получения нетканого полотна отсутствует. |
| 2 | Установка получения нетканого полотна № 2 (инв. № 4490088600) | 84 196 030 | 8 419 000 | |

**Аукцион состоится «18» октября 2010 года в 15.00 в зале заседаний Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.**

Организатор аукциона: МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.

Продавец: ОАО «Химволокно», г. Могилев-35.

Заявки принимаются ежедневно с 4 октября 2010 г. в рабочие дни с 8 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 411. **Последний день приема заявок – «15» октября 2010 года.** Заключительная регистрация участников аукциона «18» октября 2010 года с 14 до 15 часов.

Участники аукциона должны оплатить задаток в белорусских рублях на расчетный счет МГ УКП «Центр по приватизации» 3012213290010 в ГФ по Могилевской области ОАО «Белинвестбанк», МФО 153801712, УНН 700008710, последний день внесения задатка «15» октября 2010 г.

До подписания договора купли-продажи победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней, не считая дня проведения аукциона, обязан в соответствии со счетом-фактурой возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор купли-продажи заключается Продавцом и победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета торгов осуществляется победителем (лицом, приравненным к победителю) аукциона в установленном порядке.

Условия оплаты – разовый платеж.

С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов.

Полное извещение о проведении аукционных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 25.08.10 г. № 165 (26773).

## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ *3 ноября 2010 г.* ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В МИНСКОМ РАЙОНЕ

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Адрес земельного участка** | Острошицко-Городокский с/с, д. Галица | Петришковский с/с, а/г Петришки | Петришковский с/с, а/г Петришки | Петришковский с/с, а/г Петришки | Петришковский с/с, а/г Петришки | Петришковский с/с, а/г Петришки | Петришковский с/с, а/г Петришки | Горанский с/с, д. Новое Поле |
| 2 | **Кадастровый номер** | 623685202101000119 | 623685707601000673 | 623685707601000674 | 623685707601000675 | 623685707601000676 | 623685707601000677 | 623685707601000678 | 623681315101000205 |
| 3 | **Площадь земельного участка** | 0,1685 га | 0,1455 га | 0,1456 га | 0,1457 га | 0,1458 га | 0,1458 га | 0,1460 га | 0,1634 га |
| 4 | **Целевое назначение** | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | **Расходы по подготовке документации (рублей)** | 518 872 | 847 277 | 847 277 | 847 277 | 847 277 | 847 277 | 847 277 | 1 276 424 |
| 6 | **Начальная цена земельного участка (рублей)** | 17 000 000 | 15 000 000 | 15 000 000 | 15 000 000 | 15 000 000 | 15 000 000 | 15 000 000 | 13 000 000 |
| 7 | **Задаток (рублей)** | 1 600 000 | 1 400 000 | 1 400 000 | 1 400 000 | 1 400 000 | 1 400 000 | 1 400 000 | 1 200 000 |

| | | Лот 9 | Лот 10 | Лот 11 | Лот 12 | Лот 13 | Лот 14 | Лот 15 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Адрес земельного участка** | Горанский с/с, д. Новое Поле | Горанский с/с, д. Казельщина | Горанский с/с, д. Казельщина | Горанский с/с, д. Казельщина | Горанский с/с, д. Казельщина | Горанский с/с, д. Звенячи | Горанский с/с, д. Звенячи |
| 2 | **Кадастровый номер** | 623681315101000203 | 623681308101000033 | 623681308101000039 | 623681308101000044 | 623681308101000045 | 623681306601000085 | 623681306601000086 |
| 3 | **Площадь земельного участка** | 0,1561 га | 0,1219 га | 0,1341 га | 0,1303 га | 0,1502 га | 0,1413 га | 0,1432 га |
| 4 | **Целевое назначение** | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | **Расходы по подготовке документации (рублей)** | 1 245 436 | 1 120 218 | 1 120 218 | 1 120 218 | 1 120 218 | 1 109 890 | 1 109 890 |
| 6 | **Начальная цена земельного участка (рублей)** | 12 000 000 | 6 000 000 | 7 000 000 | 6 000 000 | 7 000 000 | 10 000 000 | 10 000 000 |
| 7 | **Задаток (рублей)** | 1 100 000 | 500 000 | 600 000 | 500 000 | 600 000 | 900 000 | 900 000 |

| | | Лот 16 | Лот 17 | Лот 18 | Лот 19 | Лот 20 | Лот 21 | Лот 22 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Адрес земельного участка** | Горанский с/с, д. Звенячи | Горанский с/с, д. Звенячи | Горанский с/с, д. Звенячи | Горанский с/с, д. Звенячи | Горанский с/с, д. Звенячи | Горанский с/с, д. Звенячи | Горанский с/с, д. Звенячи |
| 2 | **Кадастровый номер** | 623681306601000087 | 623681306601000088 | 623681306601000089 | 623681306601000090 | 623681306601000091 | 623681306601000092 | 623681306601000093 |
| 3 | **Площадь земельного участка** | 0,1432 га | 0,1432 га | 0,1432 га | 0,1432 га | 0,1432 га | 0,1435 га | 0,1474 га |
| 4 | **Целевое назначение** | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | **Расходы по подготовке документации (рублей)** | 1 109 890 | 1 109 890 | 1 109 890 | 1 109 890 | 1 109 890 | 1 109 890 | 1 109 890 |
| 6 | **Начальная цена земельного участка (рублей)** | 10 000 000 | 10 000 000 | 10 000 000 | 10 000 000 | 10 000 000 | 10 000 000 | 10 000 000 |
| 7 | **Задаток (рублей)** | 900 000 | 900 000 | 900 000 | 900 000 | 900 000 | 900 000 | 900 000 |

| | | Лот 23 | Лот 24 | Лот 25 | Лот 26 | Лот 27 | Лот 28 | Лот 29 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Адрес земельного участка** | Лошанский с/с, д. Бровки, участок № 32 | Лошанский с/с, д. Бровки, участок № 38 | Лошанский с/с, а/г Лошаны | Боровлянский с/с, д. Дроздово, участок № 77 | Папернянский с/с, д. Семково, участок № 100 | Папернянский с/с, д. Семково, участок № 219 | Папернянский с/с, д. Семково, участок № 220 |
| 2 | **Кадастровый номер** | 623684001601000296 | 623684001601000071 | 623684005601000273 | 623680602601000846 | 623685510601001267 | 623685510601001359 | 623685510601001358 |
| 3 | **Площадь земельного участка** | 0,2411 га | 0,2500 га | 0,1915 га | 0,1489 га | 0,1410 га | 0,1309 га | 0,1437 га |
| 4 | **Целевое назначение** | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | **Расходы по подготовке документации (рублей)** | 480 350 | 396 530 | 880 032 | 1 320 260 | 859 960 | 859 960 | 859 960 |
| 6 | **Начальная цена земельного участка (рублей)** | 24 000 000 | 24 000 000 | 31 000 000 | 95 000 000 | 30 000 000 | 26 000 000 | 28 000 000 |
| 7 | **Задаток (рублей)** | 2 300 000 | 2 300 000 | 3 000 000 | 9 000 000 | 2 900 000 | 2 500 000 | 2 700 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 03.11.2010 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 28.10.2010 г. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет Острошицко-Городокского сельисполкома № 3600621110139 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНН 600208279, ОКПО 04430447, код платежа – 04901.

На Лоты 2–7 – на расчетный счет Петришковского сельисполкома № 3600621130151 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, код 520, УНН 600052386, код платежа – 04901.

На Лоты 8–22 – на расчетный счет Горанского сельисполкома № 3604621020052 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 6000537220, код платежа – 04901.

На Лоты 23–25 – на расчетный счет Лошанского сельисполкома № 3600621060087 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600228670, код платежа – 04901.

На Лот 26 – на расчетный счет Боровлянского сельисполкома № 3600621010037 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал АСБ «Беларусбанк», ул. Карбышева, 13/2, г. Минск, УНП 600052345, код платежа – 04901.

На Лоты 27–29 – на расчетный счет Папернянского сельисполкома № 3604621120154 в филиале 614 «АСБ Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНН 600052411, ОКПО 04430453, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.
2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.
3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта).

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

